*УДК 37.013*

# ШОСТЫ ШКОЛЬНЫ ДЗЕНЬ ЯК ПЛЯЦОЎКА ВЫХАВАННЯ КАШТОЎНАСНА АРЫЕНТАВАНАЙ АСОБЫ ВУЧНЯ СРОДКАМІ ЛІТАРАТУРЫ

**А. В. Руцкая**

*Дзяржаўная установа адукацыі «Средняя школа № 12»,*
*ул. Фолюш, д. 214, 230006, г. Гродно, Беларусь, nanik2006@mail.ru*

Аб'ектам разгляду дадзенага артыкула з'яўляюцца накірункі эфектыўнай арганізацыі шостага школьнага дня. Асаблівая ўвага надаецца выкарыстанню адукацыйнага і выхаваўчага патэнцыялу беларускай літаратуры на аснове спалучэння з краязнаўствам, а ў яго межах з экскурсійнай працай. Паказваецца яе шматаспектнасць, сістэма арганізацыі і правядзення, развіццёвыя і выхаваўчыя магчымасці.

***Ключавыя словы***: шосты школьны дзень; літаратурнае краязнаўства; чытанне; экскурсіі; каштоўнасныя арыентацыі; адукацыйны прадукт.

# THE SIXTH SCHOOL DAY AS A PLATFORM FOR EDUCATING A VALUE-ORIENTED PERSONALITY OF A STUDENT BY MEANS OF LITERATURE

**A. V. Rutskaya**

*State Educational Institution «Secondary school № 12»,*
*Folush St., 214, 230006, Grodno, Belarus, nanik2006@mail.ru*

The object of consideration of this article are the directions of effective organization of the sixth school day. Special attention is paid to the use of the educational and educational potential of Belarusian literature on the basis of a combination with local history, and in its framework with excursion work. Its multidimensional nature, the system of organization and conduct, developmental and educational opportunities are indicated.

***Key words:*** sixth school day; Literary local history; reading; excursions; value orientations; educational product.

Літаратурная адукацыя ў шматстайных метадах і формах яе рэалізацыі адыгрывае важнейшую ролю ў развіцці каштоўнаснай свядомасці асобы. Гэтым і вытлумачваецца наданне ёй значнай ролі ў рамках шостага школьнага дня. Арганізацыйна-зместавае напаўненне яго з'ўляецца адной з надзённых задач, якія стаяць перад педагагічнымі калектывамі, а агульнае патрабаванне – пабудаваць працу вучняў па-сапраўднаму цікава, змястоўна, насычана. Асноўныя напрамкі дзейнасці вызначаны ў

нарматыўных дакументах Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Гэта ў першую чаргу пашырэнне і паглыбленне ведаў па вучэбным прадмеце; павышэнне цікавасці да вучэбнага прадмета; развіццё інтэлектуальных здольнасцей; фарміраванне сістэмы духоўна-маральных каштоўнасных арыентацый; выпрацоўка ўменняў выкарыстоўваць веды па вучэбным прадмеце на практыцы; развіццё камунікатыўных, творчых і аргдзейнасных навыкаў праз арганізацыю і правядзенне разнастайных відаў пазакласнай і пазашкольнай работы. Прадугледжваецца неабходнасць не толькі заахвочваць вучняў выступаць у ролі стваральнікаў, але і набываць навыкі ацэньваць і прадстаўляць плён сваёй працы, бо як слушна адзначае прафесар А. І. Бельскі, сёння «асаблівую актуальнасць набывае выяўленне таленавітых дзяцей і навучэнцаў яшчэ ў школьны перыяд, бо менавіта яны <...> у перспектыве стануць маладымі даследчыкамі» [1, с. 17]. Зыходзячы з гэтага, у арганізацыі шостага школьнага дня актуальным патрабаваннем з'яўляецца рэалізацыя сістэмнага, мэтанакіраванага і творчага падыходу да наладжвання дзейнасці вучняў. Фармальнае стаўленне да гэтай працы не можа абудзіць цікавасці, актыўнасці, не забяспечыць развіццё крэатыўных здольнасцей, не будзе стымуляваць пазнавальную актыўнасць. Таму прынцыповае значэнне набывае распрацоўка розных форм і накірункаў дзейнасці, павышэнне матывацыі падлеткаў. Немалая роля ў рэалізацыі гэтай працы належыць краязнаўству і ў яго межах экскурсіям [2]. Экскурсіі не толькі транслююць пэўныя веды па літаратуры, але і даюць магчымасць звязваць розныя прадметы школьнага цыкла, што ў сваю чаргу адкрывае перад школьнікамі магчымасці больш глыбокага разумення жыццёвых з'яў, агульначалавечага зместу пытанняў жыццебудаўніцтва, што паўстаюць перад кожным пакаленнем.

Методыка рэалізацыі і пазнавальна-выхаваўчы патэнцыял літаратурнага краязнаўства і экскурсій грунтоўна распрацаваны і прадстаўлены ў вучэбна-метадычным дапаможніку В. Я. Ляшук «Літаратурнае краязнаўства ў школе». Настаўнікі і сёння актыўна карыстаюцца матэрыяламі гэтага выдання. Аднак час змяняецца. І на сённяшні дзень экскурсіі як адзін з запатрабаваных элементаў шостага школьнага дня актыўна развіваецца, набывае новыя рысы. Свой інтэнсіўны ўплыў аказваюць працэсы тэхнізацыі, Інтэрнэт. Ведавацэнтрычная сістэма саступае свае пазіцыі крэатыўнаму навучанню, актыўна ўваходзяць у адукацыйны працэс мультымедыйныя тэхналогіі [3]. Сёння настаўнік і вучні могуць шырока выкарыстоўваць інтэрнэт-рэсурсы. З дапамогай мультымедыя маюць магчымасць рэалізоўваць творчыя праекты, ствараць новыя адукацыйныя прадукты. Усё гэта павышае зацікаўленасць вучняў да літаратурных і інтэграваных (гісторыя, выяўленчае мастацтва, музыка, эт-

награфія, прырода і інш.) экскурсій, дапамагае пры іх падрыхтоўцы. Стратэгія працы па арганізацыі экскурсій, у тым ліку і віртуальных, можа базавацца на аснове наступнай схемы:

**АРГАНІЗАЦЫЯ ЭКСКУРСІЙ**

**ЭТАПЫ**

| Падрыхтоўка | Правядзенне | Падвядзенне вынікаў |
|---|---|---|
| вызначэнне тэмы, зместу, аб'ёму і віду матэрыялу;<br>распрацоўка маршрутнай карты, планаў;<br>размеркаванне абавязкаў і заданняў;<br>падбор і азнаямленне з літаратурнымі і іншымі крыніцамі | выкарыстанне розных форм дзейнасці;<br>назіранні, азнаямленні;<br>збор і фіксацыя матэрыялу;<br>загатоўкі, напрацоўкі для адукацыйнага прадукту | абмеркаванне ўражанняў;<br>сістэматызацыя сабранага;<br>афармленне запісаў, іншага матэрыялу;<br>стварэнне ўласнага адукацыйнага прадукту;<br>вусная або пісьмовая рэфлексія |

*Схема* **«Стратэгія працы па арганізацыі экскурсій»**

Дадзеная схема не толькі ілюструе сістэму працы, але і вызначае асноўныя накірункі трансляцыі ведаў. Як бачна, першасную інфармацыю, значны аб'ём ведаў вучні атрымліваюць на этапе падрыхтоўкі. Павышае мэтанакіраванасць дадзенага этапу папярэдняя падрыхтоўка настаўнікам прыкладнай рэгіянальнай (і не толькі) мадэлі літаратурнага краязнаўства, мясцін і аб'ектаў для экскурсій. Важна, каб яны тэматычна спалучаліся з літаратурным матэрыялам, былі спраецыраваны на ўзроставыя і псіхафізічныя якасці дзяцей, на змест вучэбных праграм, фарміравалі павагу да культурна-гістарычнай спадчыны і традыцый, выхоўвалі патрыятызм, беражлівыя адносіны да прыроды, адданасць агульначалавечым ідэалам. Аб'ём працы, безумоўна, вялікі. Дапамагае вырашыць дадзеную праблему актыўнае выкарыстанне інтэграцыі як у інфармацыйным ракурсе, так і ў плане супрацоўніцтва з настаўнікамі, школьнымі бібліятэкарамі, краязнаўцамі, бацькамі. Напрыклад, вывучаючы твор Максіма Танка «Ля вогнішч начлежных», можна правесці экскурсію «Па слядах легендаў і паданняў», ажыццявіўшы вандроўку да такіх мясцін у сваім рэгіёне пад кіраўніцтвам краязнаўцаў. Паход-экскурсія «Шляхамі баявой славы» дасць магчымасць вучням пазнаёміцца з мясцінамі, звязанымі з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны, дапаможа вучням усвядоміць трагічнасць падзей таго часу, трагедыю чалавека на вайне, параўнаць, якія з'явы, факты, падзеі, аналагічныя тым, што

адлюстраваны ў вывучаемых творах, мелі месца і ў іх рэгіёне. Да гэтай экскурсіі бібліятэкары могуць аформіць выставу адпаведных твораў літаратуры. Вялікія магчымасці для экалагічнага і эстэтычнага выхавання даюць экскурсіі, што раскрываюць прыгажосць прыроды. Падчас такіх вандровак плённа развіваць навыкі напісання сачыненняў-апісанняў. Вучняў можна нацэліць падрыхтаваць фотагалерэю, падабраўшы да сваіх здымкаў радкі з вершаў. Экскурсія «У госці да майстра» пасля вывучэння апавядання Змітрака Бядулі «Бондар» скіруе да больш глыбокага разумення сутнасці творцы і творчасці. Знаёмства з народнымі майстрамі: ткачамі, разьбярамі, кавалямі, ганчарамі, мылаварамі, – не проста дае дзецям уяўленне аб рамёствах, але паказвае, якая багатая на розныя таленты наша зямля, як шануецца майстэрства, перададзенае продкамі. Фарміраванню каштоўнасных кампетэнцый садзейнічае і зварот пры вывучэнні жыцця і творчасці пісьменнікаў да ўдасканаленай і мадэрнізаванай адукацыйнай дзейнасці музеяў [4]. Як бачым, тэм для ажыццяўлення экскурсій многа. Вельмі каштоўна і тое, што праца ў гэтым рэчышчы заахвочвае да чытання, бо без прачытання неабходнай літаратуры, нельга якасна падрыхтавацца да экскурсіі, што ў сваю чаргу фарміруе станоўчы, прываблівы імідж чытання [5]. Слушна пісаў знакаміты пісьменнік і філосаф Бенджамін Франклін, што адукацыя, а ў прыватнасці чытанне, – гэта вельмі разумная інвестыцыя ў сябе. Такія аргументы важна абмяркоўваць з вучнямі. У свабоднай атмасферы сумеснай працы яны закранаюць падлеткаў, становяцца перакананнямі.

Поспех у выкарыстанні экскурсій залежыць і ад правільна абранага шляху правядзення: непрымусовых, нязмушаных відах дзейнасці, якія неабходна будзе рэалізоўваць, бо свядомасць сучаснага вучня ўжо не прымае традыцыйнага педагагічнага ўздзеяння, ды і шосты школьны дзень не арганізаваны звыклай сістэмай урокаў, ён патрабуе больш гнуткіх механізмаў дзейнасці. А таму на этапе правядзення вельмі важна правільна ставіць задачы, размяркоўваць абавязкі, улічваць інтарэсы і здольнасці. Мабілізуе вучняў загадзя нацэленая на вынікі праца, разнастайны арсенал заданняў для падрыхтоўкі розных адукацыйных прадуктаў, напрыклад, краязнаўчых карт, літ-галерэй, ілюстрацыйных матэрыялаў, фотавіктарын, прэзентацый, партфоліа, глог-плакатаў, кросэнсаў, крыжаванак і інш. Для гэтай мэты ў час экскурсіі вучням варта парэкамендаваць фіксаваць свае назіранні праз запісы, фотаздымкі, малюнкі. Такое паглыбленне ў літаратурны і краязнаўчы матэрыял станоўча ўздзейнічае на асобу вучня і ў адукацыйным, і ў выхаваўчым плане. Яшчэ вучням абавязкова неабходна даць магчымасць прадставіць, прадэманстраваць свае здабыткі, свой адукацыйны прадукт. Плённа падводзяць вынікі экскурсіі рознага віду рэфлексіі. Большасць псіхола-

гаў і педагогаў адзначаюць, што найбольш важнай для развіцця асобы з'яўляецца пісьмовая рэфлексія. На жаль, на ўроках ёй цяжка ўдзяліць дастаткова ўвагі – рамкі ўрока абмежаваныя. Творчае поле шостага школьнага дня больш шырокае, да таго ж не трэба прад'яўляць строгія патрабаванні. Настаўнік можа зарыентаваць на жанры прац, напрыклад, эсэ, замалёўка, нататка, мініяцюра і інш. Але форма не павінна абмяжоўваць жаданне падзяліцца, выказацца, перадаючы свае думкі ў пісьмовым выглядзе. Магчамасць свабодна адлюстраваць ўражанні, высновы, сумненні, ацэнкі заахвочвае вучняў.

Такім чынам, прадуманае і рацыянальнае выкарыстанне магчымасцей шостага школьнага дня праз спалучэнне актыўнай і творчай працы па літаратуры і краязнаўстве садзейнічае не толькі паглыбленню ведаў і ўменняў вучняў, але заахвочвае іх да развіцця здольнасцей, самарэалізацыі, забяспечвае трансляцыю духоўнага вопыту, выпрацоўку каштоўнасных арыентацый.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Бельскі А. І.* Актывізацыя самастойнай навукова-даследчай і творчай дзейнасці студэнтаў у кантэксце педагагічных ідэй Ф. А. Бельскага // Філалагічная адукацыя. 2019. № 3. С. 16–19.

2. Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і правядзенні экскурсій для вучняў X–XI класаў // М-ва адукацыі Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. URL: https:// adu. by / Галоўная / Адукацыйны працэс. 2022/2023 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя. – (дата звароту: 28.02.2023).

3. *Праскаловіч В. У.* Інавацыйная адукацыйная прастора філолага: рэаліі і перспектывы // Філалагічная адукацыя. 2019. № 3. С. 4–8.

4. *Праскаловіч В. У., Грынько С. Д.* Развіццё цікавасці навучэнцаў да малой радзімы пісьменніка сродкамі музея // Весн. адукацыі. 2019. № 4. С. 33–39.

5. *Тимофеева Ю. В.* Кризис чтения или новая парадигма чтения? Размышления о чтении в современном мире // Берковские чтения – 2021. Книжная культура в контексте международных кантактов: материалы VI Междунар. научн. конф. (Гродно, 26–27 мая 2021 г.) / сост.: Л. А. Авгуль, Н. В. Вдовина. – Минск: ЦНБ НАН Беларуси; М. : ФГБУН НИЦ «Наука» РАН, 2021.